**УДК 94(476)**

# ВЫДАВЕЦКАЯ СПРАВА Ў ПОЛАЦКУ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 1920-х – 1930-я гг.)

***Д.А. КАШКУР***
**(*Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО*)**

*У артыкуле прадстаўлены аналіз выдавецкай справы ў Полацку з часоў уваходу горада ў склад БССР і да пачатку Другой сусветнай вайны, ахарактарызавана дзейнасць друкарні, асноўнай задачай якой быў выпуск мясцовай газеты.*

Культурнае жыццё ў Беларусі, як і выдавецкую справу, у другой палове 1920-х – 1930-х гг. можна ахарактарызаваць як даволі неадназначную з'яву. Так, калі ў 1920-я гг. – у часы беларусізацыі – дадзеная сфера вызначалася нацыянальным зместам, то 1930-я гг. сталі часам карэннага перавароту, што азначыўся дэнацыяналізацыяй культуры, часам выхаду «сацыяльна важных» выданняў. З другога боку, увесь азначаны перыяд вылучаўся і агульнай накіраванасцю, што праяўлялася ў імкненні да цэнтралізацыі і стварэння адзінай рэспубліканскай выдавецкай сістэмы. Ужо ўлетку 1924 г. асноўныя паліграфічныя прадпрыемствы краіны былі аб'яднаны ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (з 1933 г. – Дзяржаўнае выдавецтва БССР), якое стала буйнейшай выдавецкай установай рэспублікі, што паглынула ўсе паліграфічныя прадпрыемствы краіны і амаль поўнасцю манапалізавала кнігавыданне ў Беларусі [1, с. 202]. У той жа час сферу забеспячэння грамадзян перыёдыкай цэнтралізацыя закранула ў значна меншай ступені.

Да канца 1924 г. па ўсіх рэгіёнах Беларусі мелася сетка грамадска-палітычных газет, якія выпускаліся мясцовымі друкарнямі, паведамлялі людзям свежыя навіны, а таксама прапагандавалі сярод розных катэгорый насельніцтва камуністычныя ідэі [1, с. 284].

У той жа час з'явіўся новы від прэсы – так званыя «акруговыя» газеты. Тэрмін заснаваны на тым, што выдаўцамі такіх газет былі менавіта акруговыя камітэты партыі [1, с. 285]. У Полацку да такога тыпу выдання можна аднесці газету «Полоцкий пахарь», якая пачала выходзіць у полацкай друкарні 16 верасня 1924 г. на рускай мове 2 разы на тыдзень. Дадзеная газета з'яўлялася органам Полацкай акркама КП(б) Беларусі і акрвыканкама [2, с. 154]. Выдавецтва дзейнічала ў складаных умовах: не хапала людзей, абсталявання і добрага памяшкання. З-за бясколернасці шрыфтоў, тэхнічных недахопаў гублялася цікавасць да газеты з боку шырокага кола чытачоў [3, с. 38].

Паступова сітуацыя мянялася, умовы працы выдавецтва паляпшаліся. У 1924 г. на XIII з'ездзе ВКП (б) было прынята рашэнне садзейнічаць развіццю сеткі карэспандэнтаў на месцах, што збіралі актуальны для канкрэтнай мясцовасці матэрыял. Так узнік гэтак званы рабселькораўскі рух («рабселькор» утворана ад слоў «рабочы і сельскі карэспандэнт»), які з цягам часу набыў па-сапраўднаму масавы характар [1, с. 286]. Дадзеная з'ява паўплывала і на полацкую газету. Працу селькораў актыўна прымяняў новы рэдактар «Полоцкого пахаря» М. Табінскі, які пачаў таксама выкарыстоўваць новыя формы работы, друкаваць шмат матэрыялаў па сельскай гаспадарцы, медыцыне і ветэрынарыі. Рэдактар полацкай газеты неаднаразова на працягу 1925 г. звяртаўся да гарадскіх улад з патрабаваннем памяшкання для рэдакцыі газеты. Атрымаўшы новае памяшканне (сёння гэта, верагодней за ўсё, дом № 6 па вул. Войкава), рэдакцыя і друкарня сталі працаваць у адным месцы. Калі ў рэдакцыі з'явіліся дадатковыя грошы, пры ёй адкрылася крама пісьмовых тавараў, было набыта новае абсталяванне для друкарні. Павелічэнне прыбытку павінна было, па прагнозах рэдакцыі, зменшыць кошт на газету, а таксама палепшыць яе тэхнічны бок [3, с. 38–39].

З 2 лютага 1926 г. газета была перайменавана і выходзіла на працягу ўсяго перыяду беларусізацыі ўжо пад назвай «Чырвоная Полаччына» [2, с. 154]. Газета стала выходзіць як орган Полацкага акркама КП(б) Беларусі і акрвыканкама (з 1930 г. орган Полацкага РК КП(б) Беларусі і райвыканкама), чатырохпалосным фарматам, 4 разы на тыдзень і, упершыню, на беларускай мове (у 1926–1927 гг. выходзіла, акрамя беларускай, на рускай і яўрэйскай (ідыш) мовах) [2, с. 154; 4, с. 378].

На хвалі беларусізацыі ў другой палове 20-х гг. XX ст. у газету прыйшло працаваць шмат таленавітай моладзі. У полацкай газеты з'явіўся новы рэдактар – С. Сямашка (у якасці рэдактара працаваў у 1926–1929 гг.). У сваіх успамінах ён пісаў: «Спачатку было страшнавата, бо пісаць заметкі і артыкулы зусім не тое, што кіраваць газетай, тым больш не маючы спецыяльнай журналісцкай адукацыі. Прыйшлося і працаваць у газеце, і ўзмоцнена займацца самаадукацыяй у галіне газетнай справы» [4, с. 377]. Рэдактар, апрача асноўных абавязкаў, пісаў перадавыя, падбіраў і апрацоўваў матэрыялы ў партыйны аддзел газеты, бо штат супрацоўнікаў газеты быў невялікі – чатыры чалавекі разам з рэдактарам. Сакратаром рэдакцыі быў П. Броўка, які падбіраў і рэдагаваў матэрыялы рабочай і сялянскай моладзі, камсамольскіх ячэек, вёў перапіску з рабселькорамі; яшчэ два супрацоўнікі – Т. Хадкевіч і Я. Скрыган, як літработнікі, выконвалі абавязкі рэпарцёраў у горадзе, выязджалі ў раёны для збору матэрыялаў [4, с. 377], некаторы час ў полацкай газеце працавалі Э. Самуйлёнак, А. Астрэйка, А. Дудар, А. Звонак, А. Александровіч і інш., для многіх з іх полацкая журналісцкая школа стала першай

прыступкай будучай літаратурнай дзейнасці. Менавіта яны склалі касцяк літаратурнай школы Полаччыны XX ст. Пры іх удзеле 7 сакавіка 1925 г. на базе студыі пры Полацкім педтэхнікуме была створана полацкая філія літаратурнага аб'яднання «Маладняк» [4, с. 231–297]. Да канца 1925 г. філія налічвала ўжо 18 маладых пісьменнікаў. Полацкая газета стаяла ля вытокаў стварэння літаратурнай школы Полаччыны – большасць полацкіх маладнякоўцаў былі супрацоўнікамі газеты, на старонках газеты творы маладых пісьменнікаў з'явіліся ўпершыню. Свае творы пачынаючыя пісьменнікі і паэты маглі ўбачыць таксама ў полацкіх літаратурных альманахах. У лістападзе 1926 г. выйшаў першы літаратурны зборнік маладнякоўцаў «Наддзвінне», у 1927 г. выйшаў другі альманах – «Росквіт», а ў 1928 г. – «Зарніцы» [3, с. 40].

Газета «Чырвоная Полаччына» актыўна супрацоўнічала з масамі. Яна мела каля 200 чалавек актыўных рабкораў і селькораў, з якімі падтрымлівалася пастаянная сувязь, кожны з якіх атрымліваў сваё персанальнае заданне. У газеце меліся тэматычныя старонкі на сялянскую тэму – «Вясковая камсамолія» [1, с. 284]. Дадзены раздзел ўтрымліваў у сабе не толькі заметкі па сельскай гаспадарцы, але і літаратурныя творы. На старонках полацкай газеты падчас беларусізацыі друкаваліся артыкулы па гісторыі горада, пра яго помнікі, змяшчаліся матэрыялы краязнаўчай канферэнцыі, асвятлялася пытанне адкрыцця Краязнаўчага музея, абмяркоўвалася становішча мясцовых школ, раскрывалася гісторыя мясцовага друку (НПГКМЗ КДФ-1 1177, КДФ-1 1066, КДФ-1 1270, КДФ-1 1262, КДФ-1 1264).

Ужо ў канцы 1920-х гг. з тэндэнцыяй да ўнітарнасці ў саюзным будаўніцтве палітыка беларусізацыі была прыпынена. У снежні 1933 г. на партыйным паседжанні адказнасць за яе зрыў была ўскладзена на «нацдэмаў» [5, с. 143]. З таго часу характар выдавецкай дзейнасці ў Полацку значна змяніўся.

У 1930 г. адміністрацыйныя акругі былі ўзбуйнены і з'явіліся раёны. Да 1933 г. канчаткова ўсталяваўся тэрмін «раённая» газета – газета, якая выпускалася раённым камітэтам Камуністычнай партыі. На тэрыторыі Беларусі ў той час было каля 100 раёнаў. Не кожны з райкамаў выдаваў газету, таксама выходзілі газеты на некалькі раёнаў адначасова, і ўсё ж такі колькасць раённых газет стала на той час даволі значнай [1, с. 288].У 1932 г. у БССР было ўсяго 9 штодзённых газет, да іх адносілася і полацкая раённая газета «Чырвоная Полаччына» [1, с. 288].

У 1930-я гг. газета, рэдактарам якой быў А. Рабіновіч, працягвала асвятляць жыццё Полаччыны, уводзіць новыя формы працы. У 1931 г. газета мела выязную рэдакцыю, выдавала газеты-аднадзёнкі «За калгасную сяўбу», «За ўдарныя тэмпы ўборкі», «Полаччына на дровалесазагатоўках» [2, с. 255], у 1932 г. – «Чырвоная змена» на Полаччыне». У гэты ж час газета змяніла кірунак, і усё часцей на яе старонках гучала ўхваленне савецкага кіраўніцтва і яго эканамічнай палітыкі, усё большая ўвага надавалася асвятленню пытання развіцця сельскай гаспадаркі і прамысловасці (НПГКМЗ КДФ-1 1160).

1930-я гг. сталі часам стаханаўскага руху, сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Кожнай установе выдаваўся план працы, які патрэбна было перавыканаць незалежна ад магчымасцей [6, л. 96]. Але планы на прадпрыемствах, у тым ліку ў полацкай друкарні і газеце не толькі не перавыконваліся, але і не выконваліся на 100%, што было звязана ў тым ліку з пачаткам кадравых перамяшчэнняў і рэпрэсій сярод рэдактараў газет, журналістаў і кіраўніцтва калектываў, якія выпускалі газеты. У 1935 г. нават азначыўся некаторым спадам колькасці выданняў. Так, у 1934 г. у Беларусі было 349 газет, у 1935 г. – 335; на беларускай мове ў 1934 г. – 292, у 1935 г. – 226. У 1936 г. Кніжная палата БССР перастала даваць пагадавую статыстыку, што красамоўна сведчыць аб скарачэнні колькасці выданняў [1, с. 290]. На хвалі рэпрэсій Белпаліграфкіраўніцтва ў 1936 г. кантроль над раённымі друкарнямі і адказнасць за іх гаспадарчую дзейнасць і фінансаванне перадае раённым выканаўчым камітэтам [7, л. 15].

У 1936 г. полацкая друкарня выканала гадавы план на 99%, што выклікала незадавальненне кіраўніцтва. Старшыня полацкага акрвыканкама абвінавачваў дырэктара полацкай друкарні члена КПБ Хаіма Гуткіна (на пасадзе з 1933 г.) у тым, што апошні нічога не зрабіў для разгортвання стаханаўскага руху і прымянення «новага метаду работы» на прадпрыемстве. З-за невыканання друкарняй плана было пастаўлена пытанне аб здольнасці дырэктара да далейшай працы [6, л. 25]. У сваю чаргу, дырэктар тлумачыў невыкананне плана нездавальняючым забеспячэннем сыравінай, паперай, а таксама неабгрунтаваным павышэннем плана [8, л. 23]. На наступны год з 1 сакавіка 1937 г. раённыя друкарні, у тым ліку полацкая, былі пераведзены на 7-мі гадзінны рабочы дзень, пры гэтым план вытворчасці не змяніўся [6, л. 96; 9, л. 39; 10, л. 36].

У 1937 г. друкарня «Большэвік Полаччыны» план нават пачала перавыконваць, так ужо ў студзені 1937 г. паказчык выканання дасягнуў 101,7% [10, л. 1]. Полацкую друкарню пачалі прыводзіць у прыклад іншым прадпрыемствам горада: «Ссылка на отсутствие сырья есть только «об'ективная» причина, которой многие руководители хотят замаскировать отсутствие борьбы за своевременное обеспечение предприятий сырьем, видно хотя-бы из того, что типография «Большевик Полотчины», которая 1936 г. закончила с прорывом, но благодаря тому, что руководство предприятия проявило инициативу, поворотливость, в январе месяце 1937 г. план перевыполнила, несмотря на то, что работает на дифицитном сырье. Из приведенного следует сделать вывод, что там, где была борьба за план, где это дело не предоставляется самотёку, план выполняется» [10, л. 107–108].

У друкарні быў наладжаны стаханаўскі рух, пры чым стаханаўцаў у параўнанні з іншымі работнікамі тут было больш, чым у любым іншым прадпрыемстве горада (з 28 працоўных – 10 стаханаўцаў) [10, л. 109].

Полацкая газета, выданнем якой займалася мясцовая друкарня, з 1 студзеня 1936 г. змяніла назву на «Бальшавік Полаччыны» і выходзіла як орган Полацкага акркама РК КП(б) Беларусі і акрвыканкама [2, с. 154], пад такой самай назвай, якую мела і полацкая друкарня [6, л. 62]. Газета асвятлялала розныя пытанні, але, безумоўна, найбольш важнай яе задачай была прапаганда, таму ў газеце прысутнічала шмат артыкулаў, дзе параўноўваліся ўстановы дарэвалюцыйнага Полацка з установамі Полацка савецкага, параўнанне, безумоўна, было на карысць савецкай улады. На хвалі распаўсюджвання стаханаўскага руху і сацспаборніцтва, газета пісала і пра выбітных стаханаўцаў Полаччыны, і пра перавыкананні плана (НПГКМЗ КДФ-1 1099). Таксама полацкая газета працягвала традыцыйную, пачатую з часоў «Чырвонай Полаччыны», тэму гісторыі горада (НПГКМЗ КДФ-1 1186).

Тэхнічнае абсталяванне і магчымасці выпуску выданняў у друкарні ў 1930-х гг. былі даволі добрыя, аднак не хапала добрага памяшкання. У 1937 г. дырэктар друкарні Гуткін запрасіў у Полацкага гарсавета сродкі ў колькасці 100 000 руб. на двухпавярховую прыбудову памерам 20х10 м; ён тлумачыў гэта тым, што капітальны рамонт у друкарні не адбываўся з часоў заснавання, у той час як абсталяванне, так і колькасць працоўных вырасла, будынак, такім чынам, стаў цесным [6, л. 129]. Праз некалькі месяцаў сродкі былі выдадзены, работы па дабудове двухпавярховага будынка ў 1600 кв. м планавалася правесці з 1 жніўня да 1 снежня 1937 г. [6, л. 135].

У лютым 1938 г. замест акругі з'явіўся Полацкі раён. І зноў новая назва ў полацкай газеты, на гэты раз на больш доўгі перыяд (выходзіла пад такой назвай і ў пасляваенны час). Першы нумар «Большэвіцкага шляху», органа Полацкага РК КП(б) Беларусі і райсавета выйшаў 11 ліпеня 1938 г. [2, с. 154]. Ва ўмовах абвастрэння міжнароднай абстаноўкі газета актыўна асвятляла і ваенную тэму: пісала аб савецка-польскай вайне, аб барацьбе з японцамі на пачатку Другой сусветнай вайны (НПГКМЗ КДФ-1 1140). Працягвала распаўсюджванне інфармацыі па традыцыйных тэмах: сацспаборніцтву і дасягненням савецкага кіраўніцтва (НПГКМЗ КДФ-1 1146).

Такім чынам, выдавецкая справа ў Полацку ў другой палове 1920-х – 1930-х гг. можа быць ахарактарызавана як з'ява даволі неадназначная. З аднаго боку, менавіта ў той час актыўна развівалася полацкая газета як апарат прапаганды камуністычнай ідэі, яна была рупарам савецкай улады, што добра бачна з аналізу тэм артыкулаў, змешчаных на старонках газеты. З другога боку, полацкая газета стаяла ля вытокаў літаратурнай школы Полаччыны XX ст., з яе старонак пачаўся творчы шлях шматлікіх беларускіх пісьменнікаў. Можна канстатаваць, што мясцовае выданне было тэматычна разнапланавым і цікавіла рознае кола чытачоў: сялян, працоўных, кіраўнікоў і дзеячаў культуры. Полацкі друк з'яўляецца цікавым летапісам і крыніцай для вывучэння гісторыі краю, а таксама для вывучэння агульнабеларускай гісторыі, бо выдавецкая прадукцыя – гэта люстэрка сваёй эпохі ў сацыяльным, эканамічным, палітычным і культурным сэнсе.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX – XXI стст.) / М. В. Нікалаеў [і інш.]; навук. рэд.: В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. – Мінск: БелЭн, 2011. – 436 с.
2. Газеты Беларусі 1776–1975: бібліяграфічны паказальнік / склад. Л. М. Няхайчык [і інш.]. – Мінск: Нацыянальная кніжная палата Беларусі, 2003. – 322 с.
3. Воднева, І. П. Перыядычны друк на Полаччыне ў першай палове XX ст. (1917–1936) / І. П. Воднева // Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі (да 80-годдзя Полацкага Краязнаўчага музея) / уклад. В. Д. Краско. – Полацк: НПГКМЗ, 2008. – С. 33–42.
4. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.
5. Антология мудрости народа: 500 лет белорусского книгопечатания: монография / И. В. Войтов [и др.]. – Минск: БГТУ, 2017. – 236 с.
6. Постановления, приказы и распоряжения ЦИК, СНК СССР и НАРКОМа Местной промышленности о производственных нормах и товарных знаках и др. // Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд № 115. – опись № 1. – дело № 9.
7. Постановленія СНК БССР. // Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд № 115. – опись № 1. – дело № 18.
8. Сведения о выполнени плана артелями и предприятиями местной промышленности // Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд №115. – опись №1. – дело № 29.
9. Годовые планы выпуска плановой продукции промысловасці Полацкай акругі на 1937 год] Начато 7 апреля 1937 г. // Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд №115. – опись №1. – дело № 36.
10. Планы и сведения о деятельности промышленных артелей. Сведения и обзор о выполнении плана выпуска валовой продукции предприятиями местной промышленности округа за январь 1937 г. // Зональный государственный архив в г. Полоцке. – Фонд №115. – опись №1. – дело № 38.